Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
_______________В.Р.Языковіч
Рэгістрацыйны № ВД-231/эвуч.
14.12.2020

# ГІСТОРЫЯ СВЯТ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2020

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-17 01 15-2013 па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках) і вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасці: 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя), рэгістрацыйны С17-1-76/17 вуч. ад 04.07.2017, 1-17 01 05-02 Рэжысура свят (тэатралізаваныя), рэг. № С17-1-77/17 вуч. ад 04.07.2017


**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. В. Катовіч*, старшы выкладчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»


**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В. М. Ярмалінская*, загадчык аддзела тэатральнага мастацтва Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

*А. А. Гулак,* дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 29.09.2020);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 09.12.2020)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


Адказны за рэдакцыю: В. М. Паўлючэнка

Адказны за выпуск: А. В. Катовіч

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя свят» – адна са спецыяльных дысцыплін пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне традыцыйнай святочнай культуры.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят» звязана з ведамі, уменнямі і навыкамі студэнтаў, атрыманымі пры вывучэнні дысцыплін «Традыцыйная святочная культура беларусаў», «Рэжысура свят», «Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства», «Музычна-шумавое вырашэнне свята», «Сцэнаграфія тэатралізаваных прадстаўленняў і свят», «Сучасныя формы святочнай культуры» і інш. Выкладанне дысцыпліны ва ўзаемасувязі з іншымі дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць у студэнтаў глыбокія веды і практычныя навыкі для пошуку шляхоў вырашэння творчых праблем увасаблення святочных дзеянняў.

*Мэта* выкладання вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят» – на падставе структурна-семантычнага і змястава-сімвалічнага аналізу фарміраванне ў студэнтаў неабходных ведаў і кампетэнцый у галіне традыцыйных рытуальна-абрадавых практык, якія павінны спрыяць развіццю сучаснай святочнай культуры народа.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– раскрыць асноўныя сістэмы паняццяў, звязаных са святочнай культурай розных народаў, і іх тыпалогію;

– сфарміраваць веды аб асноўных этапах гісторыі развіцця абрадавай культуры і яе святочных формаў;

– навучыць сінтэзаваць каштоўнасці матэрыяльнай і нематэрыяльнай этнакультурнай спадчыны Беларусі, вызначаць шляхі і спосабы актуалізацыі традыцыйных святочна-абрадавых практык у сучасным сацыякультурным працэсе.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

*ведаць:*

– гісторыю фарміравання каляндарных сістэм розных народаў свету;

– этапы развіцця свята як феномена сусветнай культуры, разнастайныя трактоўкі яго вызначэння і межы выкарыстання састаўных частак свята (міф, рытуал, абрад, культ);

– асаблівасці светапоглядных сістэм у розных традыцыйных культурах;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– універсальную структуру рытуальна-абрадавых комплексаў;

– асноўныя коды фарміравання святочна-абрадавых комплексаў;

– сэнсавую і каштоўнасную накіраванасць святочных формаўтварэнняў у культурах розных народаў свету;

– тэндэнцыі ў развіцці святочнай культуры Беларусі (прынцыпы арганізацыі пастановак святочных мерапрыемстваў, іх новыя формаўтварэнні);

*умець:*

– вылучаць адметныя рысы пэўнай гістарычнай эпохі і ўвасабляць іх у святочным дзеянні ў сучасных умовах;

– сістэматызаваць, параўноўваць і абагульняць веды пра рознапланавыя сучасныя святочныя формаўтварэнні;

– распрацоўваць канцэптуальныя палажэнні аўтарскіх рэжысёрскіх праектаў на аснове ведаў па нематэрыяльнай культурнай спадчыне беларусаў;

– ажыццяўляць праекты фальклорна-этнаграфічнага вырашэння свят рознай тэматыкі, высокапрафесійна ўвасабляць ідэі абрадавых комплексаў на практыцы;

– выкарыстоўваць набытыя падчас вывучэння спецыяльнай дысцыпліны веды ў выкладчыцкай дзейнасці;

*валодаць:*

– метадамі і прыёмамі арганізацыі стварэння праектаў свят рознай тэматыкі з фальклорна-этнаграфічным вырашэннем;

– прынцыпамі пабудовы кампазіцыі, ведамі семантыкі і сімволікі галоўных персанажаў, атрыбутаў, рытуальных дзеянняў, адзення, словаў і іншых складовых частак свят рознай тэматыкі і розных гістарычных эпох;

– методыкай раскрыцця рытуальна-гульнёвай кампаненты традыцыйных абрадавых комплексаў.

Мэтанакіраванае і асэнсаванае выкарыстанне ведаў па гісторыі культуры, узнікнення календара, традыцыйных свят і абрадаў розных народаў свету, параўнальны аналіз агульных рыс і адметнасцей дапамагае сфарміраваць неабходныя кампетэнцыі сучаснага высокакваліфікаванага рэжысёра свят і абрадаў.

Засваенне матэрыялу вучэбнай праграмы па дадзенай вучэбнай дысцыпліне павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Акадэмічныя кампетэнцыі*:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным генерыраваць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-9. Умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

*Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі*:

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

*Прафесійныя кампетэнцыі:*

ПК-7 Карыстацца сучаснымі сродкамі тэлекамунікацый і глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі.

ПК-8. Праводзіць культурна-асветніцкія мерапрыемствы для патрыятычнага, маральнага, эстэтычнага выхавання ўсіх катэгорый насельніцтва ва ўстановах культуры, спорту і адукацыі і інш.

ПК-11. Кансультаваць кіраўнікоў і ўдзельнікаў творчых, спартыўных, ваенных і іншых калектываў падчас падрыхтоўкі творчых праектаў.

ПК-14. Выкарыстоўваць новыя напрамкі ў сучасных рэжысёрскіх тэхналогіях.

ПК-17. Выкарыстоўваць фальклорна-этнаграфічны матэрыял традыцыйных абрадаў і свят для рэстаўрацыі, рэканструкцыі або трансфармацыі яго ў сучаснае свята.

ПК-18. Ажыццяўляць на аснове культурна-гістарычнай спадчыны новыя святочныя формаўтварэнні ў сучасным сацыякультурным асяроддзі.

Кампетэнцыі, якія павінны быць сфарміраваны ў студэнтаў пасля вывучэння дысцыпліны, патрабуюць засваення паняццяў: «рытуальна-абрадавы комплекс», «святочна-абрадавая падзея», «розныя культурныя коды», «гісторыя паходжання

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

або ўзнікнення свята», «час і месца дзеяння», «персанажы свята», «сімволіка абрадавых дзеянняў і атрыбутаў, абрадавых страў і адзення» і інш.

На засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят», дасягненне пастаўленай мэты і вырашэнне задач прадугледжана 148 гадзін, з іх аўдыторных – 68: лекцыі – 50, практычныя заняткі – 18 гадзін.

Форма кантролю ведаў студэнтаў – залік, экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Уводзіны*
*Свята як частка культуры*

Прадмет, мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят» – адной са спецыяльных дысцыплін пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне святочнай культуры. Этымалогія феномена свята. Сувязь з паняццямі «відовішча», «рытуал», «абрад», «цырымонія». Іерафанія Сонца і Месяца. Уздзеянне міфаў, культаў, магіі, вераванняў, рэлігіі на фарміраванне свята, абраду, рытуалу і іншых урачыстых падзей. Класіфікацыя свят і абрадаў.

### Раздзел І. Гісторыя фарміравання беларускага народнага календара ў кантэксце традыцый сусветных календароў

*Тэма 1. Каляндар як складовая частка культуры. Месяцовы і сонечны календары. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў*

Культуралагічнае паняцце «каляндар». Умоўнасць «кропкі адліку» часу. Легенды аб стварэнні свету. Міфалагічная цыклічнасць часу. Біблейскія паданні аб часе стварэння свету. Цыклічнасць і лінейнасць часу. Эра ад стварэння свету. Хрысціянская эра.

Назіранні людзей за рухам Сонца і Месяца, суаднесенасць з імі выканання сельскагаспадарчых работ.

Уплыў Месяца і Сонца на фарміраванне сістэмы парадкавання часу. Рух Месяца, традыцыйныя ўяўленні аб фазах Месяца. Адзінкі вымярэння часу: тыдзень, месяц. Асновы пабудовы старажытных месяцовых календароў шумераў і вавіланян. Старажытныя месяцовыя календары: іўдзейскі, мусульманскі, рымскі.

Традыцыйныя ўяўленні аб асноўных пераходных момантах у задыякальным руху: дні зімовага і летняга сонцастаяння, веснавога і восеньскага раўнадзенства. Паняцце «сонечны год», адзінкі вымярэння часу: суткі і год. Старажытнаегіпецкі сонечны каляндар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 2. Прыродазнаўчыя асновы пабудовы беларускага народнага календара*

Асновы пабудовы беларускага народнага календара. Сістэма свят і абрадаў народнага календара беларусаў у іх гістарычнай дынаміцы. Семантыка і сімволіка міфа-рытуальных і сакральна-магічных абрадавых дзеянняў, паводзін, рэгламентацый, абмежаванняў, прадпісанняў і забарон; выкарыстанне шырокага кола абрадавых атрыбутаў. Часавая суаднесенасць галоўных свят традыцыйнага календара беларускага народа.

*Тэма 3. Шляхі фарміравання юліянскай сістэмы летазлічэння як прататыпа сучаснага календара*

Перадумовы рэформы старажытнарымскага календара. Гістарычная роля Гая Юлія Цэзара і грэчаскага астранома Сазігена Александрыйскага. Вызначэнне даўжыні сонечнага года. Паняцце «пачатак новага года». Дванаццацімесячны год. Парадак месяцаў. Напаўняльнасць месяца днямі. Пастаянная дата дня веснавога раўнадзенства. Высакосны дзень і высакосны год. Ушанаванне стваральніка новай сістэмы злічэння часу Гая Юлія Цэзара і яго паслядоўніка рымскага імператара Аўгуста.

*Тэма 4. Светапоглядныя асновы хрысціянства. Прынцыпы структуравання хрысціянскага календара. Свята Пасхі. Пасхалія. Суаднесенасць веснавых свят беларускага традыцыйнага календара з пасхальным цыклам*

Новая гісторыя існавання чалавецтва на зямлі, новыя крытэрыі засваення часу. Царква як інстытут хрысціянства. Каталіцызм, праваслаўе, пратэстантызм.

Асновы пабудовы і структуравання хрысціянскага календара: ушанаванне асноўных падзей з жыцця Ісуса Хрыста і Дзевы Марыі.

Гістарычная роля Нікейскага сабора (325 г.) у фарміраванні будучага сусветнага календара. Абавязковае прыняцце юліянскага календара. Увядзенне эры злічэння часу ад Раства Хрыстова. Гісторыя святкавання іудзейскай Пасхі. Сэнс слова «пасха». Тайная вячэра, або апошняя Пасха, у жыцці Ісуса Хрыста. Распрацоўка правілаў вызначэння святкавання хрыс-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ціянскай Пасхі. Пасхалія, або час Хрыста. Асаблівасці структуравання хрысціянскай Пасхаліі – «календара ў календары».

Суаднесенасць веснавых свят беларускага народнага календара з пасхальным цыклам: рухомыя і нерухомыя святы.

### *Тэма 6. Дыялог культур: суіснаванне народна-ведыйскага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце. Грыгарыянская рэформа календара*

Прыняцце хрысціянства ўсходнеславянскімі народамі. Складаны духоўны светапоглядны, сацыякультурны, прававы і палітычны працэс набліжэння або спалучэння дзвюх культур – народна-ведыйскай і хрысціянскай. Паняцце «двухвер'е», або «народнае праваслаўе». Феномен беларускай ментальнасці. Сэнсава-семантычная абумоўленасць узнікнення абрадавых комплексаў традыцыйнай культуры.

Недакладнасці юліянскага календара (неадпаведнасць юліянскага года трапічнаму, або сонечнаму, цыклу). Умова веснавога святкавання хрысціянскай Пасхі як неабходнасць рэфармавання юліянскага календара. Гістарычная роля Папы Рымскага Грыгорыя XIII у рэфармаванні календара. Умовы каляндарнай рэформы.

Паступовае прыняцце грыгарыянскай рэформы краінамі свету. Пратэст Рускай праваслаўнай царквы супраць грыгарыянскай рэформы. Перадумовы пераходу Савецкай Расіі на грыгарыянскі стыль летазлічэння.

## **Раздзел II. Традыцыйныя рытуалы і святы у сусветных культурах**

### *Тэма 1. Рытуалы і святы ў культуры Старажытнага Егіпта. Гісторыя асноўных традыцыйных свят Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма*

Культы і святкаванні старажытных цывілізацый. Сезонныя перыяды працы і адпачынку ў абрадава-святочнай дзейнасці культур старажытнасці. Тыпалогія свят у Старажытным Егіпце. Значныя рэлігійныя рытуалы і святы фараонаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міфалогія старажытных грэкаў як аснова абрадавых дзей. Галоўныя святы ў культуры Старажытнай Грэцыі: свята ў гонар збору ўраджая вінаграду «Дзіянісавы дзеі»; Афінскія, Панафінскія, Піфійскія і іншыя гульні. Відовішчы ў старажытнагрэчаскім амфітэатры. З'яўленне Алімпійскіх гульняў.

Галоўныя рытуалы ў культуры Старажытнага Рыма: атэлана, буфанада, сатурналія як састаўныя часткі свят Апалона, Плебейскіх і Рымскіх гульняў.

*Тэма 2. Гісторыя асноўных традыцыйных свят старажытных Кітая і Японіі*

Дунчжыцзэ – свята ў гонар зімовага сонцастаяння ў Старажытным Кітаі. Новы год, або Свята вясны. Свята лодак-драконаў. Свята ліхтароў. Сімволіка галоўнай стравы свята. Сэнс навагодніх падарункаў. Цынмін («Свята чысціні і яснасці») – дзень памінання памерлых. Сучаснае ўвасабленне святочных кітайскіх традыцый.

Вызначэнне сэнсу жыцця праз святочную культуру Японіі. Танабата – свята ў гонар кахання і вернасці. Святкаванне Дня заснавання краіны – аднаго з галоўных свят. Хіган – свята пакланення продкам, якое адзначаецца штогод у дні вясновага і восеньскага раўнадзенства. Абон (Бон) – дні памінання, якія таксама называюць Святам ліхтароў.

*Тэма 3. Святочная культура Сярэдневякоўя*

Распад Рымскай імперыі, станаўленне феадалізму. Супрацьстаянне хрысціянства і язычніцтва. Хэлоўін. Карнавал. Гістрыёны, жанглёры, ваганты. Жанравая дыферэнцыяцыя іх творчасці. Ваганты і сучасная студэнцкая субкультура.

*Тэма 4. Святочная культура эпох Рэнесансу і Рэфармацыі*

Паняцці «эпоха Рэнесансу», «эпоха Рэфармацыі». Жанры сярэдневяковых прадстаўленняў. Узнікненне містэрыяльнага тэатра. Драматургія містэрыі па трох асноўных частках Бібліі. Тэатр дэль артэ. Камедыя масак. Працэсія. Маскарад. Смехавая культура Рэнесансу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры

*Тэма 1. Структура традыцыйнага календара беларусаў. Тэорыя каляндарных сегментаў. Універсальная структура рытуальна-абрадавага комплексу*

Тэорыя каляндарных сегментаў як пошук інавацыйнага падыходу да разумення структуры традыцыйнага календара. Рытуал як стабілізуючы пачатак. Традыцыя – свяшчэнны закон продкаў. Праблема міжфазавых пераходаў. Мадэліраванне новай рэчаіснасці. Гармонія ў кантэксце этнанацыянальнай ментальнасці.

Структура рытуальна-абрадавага комплексу, яе асноўныя складовыя часткі. Назвы календара – народнага (рэгіянальныя варыянты) і хрысціянскага. Міфалагічныя вытокі (для свят народнага календара). Гісторыя хрысціянства (для свят хрысціянскага календара). Прымеркаванасць правядзення святочнага абраду да руху Сонца, пары года, фазы Месяца, дня тыдня і інш. Даты календара згодна канфесійнай прыналежнасці. Месца правядзення абраду (сімвалічныя прыродна-ландшафтныя мясціны або месцы, звязаныя з працай чалавека ці яго існаваннем). Галоўныя выканаўцы і персанажы. Абавязковыя рытуальныя адзенне і атрыбуты. Умова наяўнасці рытуальнай ежы. Рытуальныя дзеянні падчас выканання абраду. Рытуальныя словы. Рытуальныя танцы і тэатралізаваныя ігрышчы.

*Тэма 2. Каляндарны сегмент беларускіх народных зімовых свят*

Каляндарны сегмент зімовых свят: асноўныя святы гэтага цыклу, прыродазнаўчая і гістарычная абумоўленасць іх існавання.

Каляды: сімвалічная мяжа паміж старым і новым годам. Структура рытуальна-абрадавага комплексу «Каляды». Прымеркаванасць свята да дня зімовага сонцастаяння. Піліпаўскі пост напярэдадні двухтыднёвага свята. Провады Калядаў. Абрад «Цягнуць Каляду на дуба».

Грамніцы, Грамнічнік – паварот да новага жыцця. Структура рытуальна-абрадавага комплексу. Вобраз бога Перуна, або

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Грамаўніка. Грамнічная свечка. Гісторыя хрысціянскага свята Стрэчання: прысвячэнне Богу немаўляці Ісуса Хрыста.

Вялес, Валоссе, Аўлас. Уяўленне пра старажытных беларусаў-волатаў. Пярун і Вялес: саюз неба і зямлі. Хрысціянскія вытокі свята: жыццяпіс святога Уласія.

*Тэма 3. Каляндарны сегмент беларускіх народных веснавых рухомых і нерухомых свят*

Паняцці «рухомыя» і «нерухомыя святы». Уплыў хрысціянскай Пасхаліі на структуру народнага календара. Каляндарны сегмент веснавых рухомых свят. Асноўныя святы гэтага цыклу, прыродазнаўчая і гістарычная абумоўленасць іх існавання (Масленіца – Мясапуст). Беларускі карнавал: маскі і маскаванне, пераапрананне. Масленічныя гулянні: катанні з гор, «рысталішчы», «прызы», або катанне на конях. Сімволіка вярбы ў традыцыйнай культуры славян і хрысціянскай культуры. Свята Вербніцы. Змест і часавая прымеркаванасць царкоўнага свята «Уваход Гасподзень у Іерусалім». Страсны тыдзень: штодзённая паслядоўнасць святочных падзей. Вялікі (Чысты) чацвер. Вялікдзень – гарманічнае суладдзе дзвюх традыцый. Храналогія пасхальных падзей. Сімволіка яйка ў традыцыйнай культуры беларусаў. Феномен валачобніцтва на Беларусі. Валачобныя песні як каляндар сельскагаспадарчых клопатаў. Дзіцячыя гульні, забавы, пацехі Велікоднага дня. Паміналне продкаў на першым Велікодным тыдні: Наўскі Вялікдзень, Радаўніца. Структура рытуальна-абрадавага комплексу «“Ваджэнне стралы” – Ушэсце». Траецкія Дзяды – складаны комплекс веснавога ўшанавання продкаў. Палескі абрад «Куст». Абрад «Провады русалкі» – завяршальны этап Зялёных свят.

Каляндарны сегмент веснавых нерухомых свят. Асноўныя святы гэтага цыклу: «Гуканне вясны», «Саракі», прыродазнаўчая і гістарычная абумоўленасць іх існавання. Рэгіянальныя варыянты («Чырачка»). Гушканне на арэлях як абавязковае абрадавае дзеянне падчас сустрэчы вясны. Вобраз мядзведзя ў вусна-паэтычнай спадчыне славян. Свята «Камаедзіца». Вобраз бусла ў вусна-паэтычнай спадчыне славян. Свята Дабравешчання. Язычніцкі бог Ярыла – папярэднік Юр'я. Структура рытуальна-абрадавага комплексу «Мікола веснавы», «Мікольшчына».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Каляндарны сегмент*
*беларускіх народных летніх свят*

Асноўныя святы гэтага цыклу, прыродазнаўчая і гістарычная абумоўленасць іх існавання. Язычніцкае свята ў гонар Сонца – Купалле. Семантыка назвы свята з пункту гледжання народнай і хрысціянскай традыцый. «Сёння Купала, заўтра – Ян» – вызначэнне часу святкавання язычніцкага Купалля і хрысціянскага Івана Купалы. Легенда пра папараць-кветку. Вянок як найважнейшы сакральны атрыбут народных абрадаў. Роля моладзі перадшлюбнага ўзросту як пераемніцы традыцый.

Структура рытуальна-абрадавага комплексу «Пятро і Павел». Вобраз Перуна, або Грамаўніка, у міфа-рытуальнай спадчыне славян. Біблейскае паданне пра прарока Ілью. Гарманічнае спалучэнне дзвюх традыцый у адным вобразе.

Семантыка назваў асноўных складовых частак свята «Зажынкі – Жніво – Дажынкі». Сноп «дзед» і яго роля ў выкананні абрадаў сямейна-родавай накіраванасці на працягу года.

Абумоўленасць святкавання кожнага з трох Спасаў гістарычнымі падзеямі, звязанымі з жыццём Ісуса Хрыста: Спас Мядовы (Макавей), Яблычны Спас, Спас Арэхавы (Спас на палатне).

*Тэма 5. Каляндарны сегмент*
*беларускіх народных восеньскіх свят*

Каляндарны сегмент восеньскіх свят. Асноўныя святы гэтага цыклу, прыродазнаўчая і гістарычная абумоўленасць іх існавання. Прымеркаванасць свята «Багач» да дня восеньскага раўнадзенства. Талака як адзін з галоўных прынцыпаў у адносінах паміж аднавяскоўцамі.

Першы этап замыкання зямлі на зімовы спачын – свята Узвіжання. Другі этап замыкання зямлі – Пакроў.

Культ продкаў у традыцыйнай культуры беларусаў. Сістэма сацыякультурных рэгламентацый у дачыненні да ўшанавання памерлых. Свята «Восеньскія (Дзмітраўскія, Міхайлаўскія) Дзяды». Выхаваўчая роля дзён памінання продкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 6. Батлейка – беларускі народны лялечны тэатр. Кірмаш як з'ява святочнай культуры*

Зараджэнне народнага лялечнага тэатра ў Беларусі пад назвай «Батлейка», або «Жлоб», «Віфлеем», «Яселка», «Вярцеп». Тыпы беларускай батлейкі. Рэлігійная тэматыка. Драматургія батлеечных спектакляў, музычнае вырашэнне. Распаўсюджванне батлейкі вандроўнымі студэнтамі-семінарыстамі.

Паняцце «прастольнае свята». Мэты арганізацыі кірмашоў. Кірмашы – Траецкі, Ільінскі, Спасаўскі, Пакроўскі і інш. Рэгіянальныя асаблівасці правядзення кірмашоў. Разнастайнасць кірмашовых гульняў і іншых забаў.

## Раздзел IV. Беларуская святочная культура: традыцыі і інавацыі

*Тэма 1. Дзяржаўныя святы і цырыманіялы. Гістарычныя і ваенныя рэканструкцыі*

Дзяржаўнае свята: гістарычнае або грамадска-палітычнае значэнне для краіны, станоўчы ўплыў на развіццё дзяржаўнасці, грамадства, краіны. Спіс дзяржаўных свят Рэспублікі Беларусь. Паняцце «цырыманіял». Шэраг дзеянняў (абрадаў, цырымоній) і прамоў сімвалічнага характару, традыцыйна абавязковых у грамадскім, палітычным жыцці краіны. Параўнальны аналіз цырыманіяльных мерапрыемстваў у дзяржавах свету ў розныя гістарычныя адрэзкі часу.

Гістарычная або ваенна-гістарычная рэканструкцыя як відовішча. Працэс аднаўлення матэрыяльнай або духоўнай культуры пэўнай гістарычнай эпохі, рэгіёна, творчы экскурс у гісторыю. Рух гістарычнай рэканструкцыі на сучасным этапе. Гістарычныя касцюмы і дэкарацыі. Піратэхніка. Моладзевыя аб'яднанні. Фэсты ваенна-гістарычных клубаў.

*Тэма 2. Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі. Сусветныя акцыі «Ноч музеяў» і «Бібліяноч»*

Гісторыя Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў (Гавана, Масква). Фестываль музыкі ў г. Сопат (Польшча). Міжна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

родны музычны фестываль «Еўрабачанне». Дзіцячы міжнародны музычны фестываль «Еўрабачанне».

Сучасныя традыцыйныя міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі Беларусі: Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, г. Гродна; Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод», г. Гомель; Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», г. Віцебск; рэспубліканскае купальскае свята «Александрыя збірае сяброў», аг. Александрыя, Магілёўская вобл.; Рэспубліканскі ўсебеларускі фестываль народнага гумару «Аўцюкі», в. Вялікія Аўцюкі, Калінкавіцкі р-н, Гомельская вобл.; Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка», г. Клімавічы, Магілёўская вобл., і інш.

Новыя фарматы культурнага адпачынку гараджан. «Ноч музеяў» – сусветная акцыя, прымеркаваная да Міжнароднага дня музеяў. Начны агляд музейных экспазіцый. «Бібліяноч» – міжнародная сацыяльна-культурная акцыя, прысвечаная чытанню. Пашырэнне часу і фармату працы бібліятэк, кнігарань, літаратурных музеяў і арт-прасторы.

Мэта акцый – паказаць рэсурс, магчымасці, патэнцыял сучасных музеяў і бібліятэк краіны, зацікавіць моладзь наведваць гэтыя ўстановы. Тэматыка акцый. Папулярызацыя чытання і абуджэнне цікавасці да музейных экспазіцый. Арганізацыя кірмашоў, тэатралізаваных паказаў, маскарадаў, канцэртаў, выставак і інш.

### *Тэма 3. Мастацка-спартыўныя відовішчы. Сучасныя Алімпійскія, Паралімпійскія, Еўразійскія гульні*

Відовішчы і прадстаўленні на стадыёнах. Комплекс разнастайных спартыўных, культурных, мастацка-тэматычных мерапрыемстваў на вялікай тэрыторыі (стадыёны, паркі, вуліцы). Навыкі арганізацыі вялікай колькасці ўдзельнікаў. Сродкі мастацкай выразнасці. Трохмерная адкрытая прастора. Амфітэатр. Мастацка-спартыўныя мерапрыемствы на вадзе.

Спартакіяда. Алімпіяда. Паралімпіяда. Традыцыйныя цырымоніі адкрыцця і закрыцця Алімпійскіх і іншых гульняў і спартыўных відовішчаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Прафесійныя святы. Святы гарадоў і вёсак*

Прафесійнае свята – сацыякультурная інтэграцыя людзей адной прафесіі або сферы дзейнасці. Мэта правядзення, формы арганізацыі прафесійнага свята. Каляндар прафесійных свят Рэспублікі Беларусь.

Свята горада. Свята вёскі. Юбілейныя святы: адметнасці пастаноўкі і арганізацыі. Гісторыя стварэння населенага пункта. Ганаровыя жыхары краю. Парады, шэсці, народныя гулянні, кірмашы, святочныя канцэрты, вулічныя перформансы, выстаўкі, спаборніцтвы, феерверкі, салюты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | лабараторныя заняткі | | |
| **Уводзіны.** Свята як частка культуры | 2 | | | | |
| **Раздзел І. Гісторыя фарміравання беларускага народнага календара ў кантэксце традыцый сусветных календароў** | | | | | |
| *Тэма 1.* Каляндар як складовая частка культуры. Месяцовы і сонечны календары. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў | 2 | | | | |
| *Тэма 2.* Прыродазнаўчыя асновы пабудовы беларускага народнага календара | 2 | | | | |
| *Тэма 3.* Шляхі фарміравання юліянскай сістэмы летазлічэння як прататыпа сучаснага календара | 2 | | | | |
| *Тэма 4.* Светапоглядныя асновы хрысціянства. Прынцыпы структуравання хрысціянскага календара. Свята Пасхі. Пасхалія. Суаднесенасць веснавых свят беларускага традыцыйнага календара з пасхальным цыклам | 2 | | | | |
| *Тэма 5.* Дыялог культур: суіснаванне народна-ведыйскага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце. Грыгарыянская рэформа календара | 2 | | | | |
| **Раздзел ІІ. Традыцыйныя рытуалы і святы ў сусветных культурах** | | | | | |
| *Тэма 1.* Рытуалы і святы ў культуры Старажытнага Егіпта. Гісторыя асноўных традыцыйных свят Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма | 2 | 2 | | 2 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 2.* Гісторыя асноўных традыцыйных свят старажытных Кітая і Японіі | 2 | 2 | | 2 | абарона прэзентацыі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 3.* Святочная культура Сярэднявякоўя | 2 | 2 | | 2 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 4.* Святочная культура эпох Рэнесансу і Рэфармацыі | 2 | 2 | | 2 | абарона прэзентацыі |
| **Раздзел ІІІ. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры** | | | | | |
| *Тема 1.* Структура традыцыйнага календара беларусаў. Тэорыя каляндарных сегментаў. Універсальная структура рытуальна-абрадавага комплексу | 2 | | | | |
| *Тема 2.* Каляндарны сегмент беларускіх народных зімовых свят | 2 | | | | |
| *Тема 3.* Каляндарны сегмент беларускіх народных веснавых рухомых і нерухомых свят | 2 | | | | |
| *Тема 4.* Каляндарны сегмент беларускіх народных летніх свят | 2 | | | | |
| *Тема 5.* Каляндарны сегмент беларускіх народных восеньскіх свят | 2 | | | | |
| *Тема 6.* Беларускі народны лялечны тэатр «Батлейка». Кірмаш як з'ява святочнай культуры | 2 | | | | |
| **Раздзел IV. Беларуская святочная культура: традыцыі і інавацыі** | | | | | |
| *Тема 1.* Дзяржаўныя святы і цырыманіялы. Гістарычныя і ваенныя рэканструкцыі | 2 | 2 | | 2 | абарона прэзентацыі |
| *Тема 2.* Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі. Сусветныя акцыі «Ноч музеяў» і «Бібліяноч» | 2 | 2 | | 2 | абарона прэзентацыі |
| *Тема 3.* Мастацка-спартыўныя відовішчы. Сучасныя Алімпійскія, Паралімпійскія, Еўразійскія гульні | 2 | | | | |
| *Тема 4.* Прафесійныя святы. Святы гарадоў і вёсак | 2 | 2 | | 2 | абарона прэзентацыі |
| **Усяго…** | **40** | **14** | | **14** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*


*Байбурин, А. К.* Ритуал в традиционной культуре / А. К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.

*Барышаў, Г. І.* Батлейка / Г. І. Барышаў / М-ва культуры Рэсп. Беларусь ; Беларускі ўніверсітэт культуры. – Мінск, 2000. – 270 с.

*Бахтин, М. М.* Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса / М. М. Бахтин. – М. : Худож. лит., 1990. – 543 с.

*Брабич, В. М.* Зрелища Древнего мира / В. М. Брабич, Г. С. Плетнева. – Л. : Искусство, 1971. – 78 с.

Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.

*Генкин, Д. М.* Массовые праздники : учеб. пособие для студентов ин-тов культуры / Д. М. Генкин. – М. : Просвещение, 1975. – 140 с. : с ил.

*Глан, Б. Н.* Праздник всегда с нами / Б. Н. Глан. – М. : Союз театральных деятелей РСФСР, 1988. – 189 с.

*Гуд, П. А.* Ад Каляд да Пакроваў / П. А. Гуд ; рэд.-склад. Л. І. Жук. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – 223 с. – (Беларусь святочная).

*Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.

*Гуд, П. А.* Мастацтва феерверкаў: вогненна-светлавыя дзеі народаў свету / П. А. Гуд. – Мінск : Мэджик Бук, 2007. – 99 с.

*Гуд, П. А.* Тэхналогія стварэння свята : вучэб. дапам. / П. А. Гуд. – 2-е выд., стэр. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 224 с.

*Гутько, О. В.* История праздников : учеб. пособие / О. В. Гутько. – Челябинск, 2013. – 189 с.

*Даркевич, В. П.* Народная культура средневековья. Светская праздничная жизнь в искусстве IX–XVI вв. / В. П. Даркевич ; отв. ред. Г. К. Вагнер. – М. : Наука, 1988. – 344 с.

Жыцця адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.


РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

Зямля стаіць пасярод свету. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1996. – Кн. 1. – 591 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 2. – 413 с.

*Катовіч, А.* Зімовыя святы : навук.-папуляр. выд. / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастац. літ., 2004. – 119 с.

*Катовіч, А.* Летнія святы : навук. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – Кн. 1. – 368 с.

*Климишин, И. А.* Календарь и хронология / И. А. Климишин. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Наука, 1985. – 320 с.

*Конович, А. А.* Театрализованные праздники и обряды в СССР / А. А. Конович. – М. : Высш. шк., 1990. – 206 с.

Массовые праздники и зрелища : сб. / сост. Б. Н. Глан. – М. : Искусство, 1961. – 327 с.

*Орлов, О. Л.* Праздничная культура России / О. Л. Орлов ; Санкт-Петербургский гос. ун-т культуры и искусств. – СПб., 2001. – 160 с.

*Орлов, О. Л.* Теоретические аспекты изучения праздничной культуры России / О. Л. Орлов. – СПб. : СПбГУКИ, 2001.

*Пави, П.* Словарь театра / П. Пави. – М. : ГИТИС, 2003. – 504 с.

*Рябков, В. М.* Антология форм праздничной и развлекательной культуры России (первая половина XX в.) : учеб. пособие / В. М. Рябков ; Челяб. гос. акад. культуры и искусств. – Челябинск : Полиграф-Мастер, 2007. – Т. 4. – 870 с.

*Сегал, М. Д.* Физкультурные праздники и зрелища / М. Д. Сегал. – М. : Физкультура и спорт, 1977. – 187 с.

Театрализованное представление в массовом празднике – юбилее города : метод. пособие / Минский ин-т культуры ; авт.-сост. Ю. М. Черняк. – Минск, 1989. – 32 с.

*Туманов, И. М.* Режиссура массового праздника и театрализованного концерта : учеб. пособие для ин-тов культуры / И. М. Туманов. – М. : Просвещение, 1976. – 86 с.

*Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ : учеб. пособие для студентов / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 223 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Шароев, И. Г.* Театр народных масс / И. Г. Шароев. – М. : ГИТИС, 1978. – 123 с.

*Шароев, И. Г.* Режиссура эстрады и массовых представлений : учебник для студентов театральных высш. учеб. заведений / И. Г. Шароев. – 3-е изд., испр. – М. : РАТИ-ГИТИС, 2009. – 336 с.

*Шубина, И. Б.* Драматургия и режиссура зрелища: Игра, сопровождающая жизнь : учеб.-метод. пособие / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 288 с.

*Дадатковая*

Беларусы : у 12 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.

*Генкин, Д. М.* Массовые театрализованные праздники и представления : учеб.-метод. пособие / Д. М. Генкин ; Всесоюзный науч.-метод. центр нар. творчества и культпросветработы. – М., 1985. – 87 с.

*Гуд, П. А.* Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск : Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.

*Котович, О. В.* Сакральный мир традиции. 99 уроков народной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2018. – 578 с.

*Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры : навук. выд. / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.

Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М. : Советская Энциклопедия, 1987. – Т. 1 : А-К. – 671 с.

Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М. : Советская Энциклопедия, 1988. – Т. 2 : К-Я. – 719 с.

*Огаркова, Н. А.* Церемонии, празднества, музыка русского двора. XVIII – начало XIX века / Н. А. Огаркова. – СПб. : Дмитрий Буланин, 2004. – 145 с.

*Панфилов, В. В.* Режиссеру праздника об игре / В. В. Панфилов. – М. : ВЦХТ, 2004. – 176 с.

*Раманюк, М. Ф.* Беларускае народнае адзенне / М. Ф. Раманюк. – Мінск : Беларусь, 1981. – 473 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Розовский, М. Г.* Режиссер зрелища / М. Г. Розовский. – М., 1973.

*Шамшур, В. В.* Праздненства революции: организация и оформление советских массовых торжеств в Белоруссии / В. В. Шамшур. – Минск : Наука и техника, 1989. – 157 с.

*Шубина, И. Б.* Организация досуга и шоу-программ. Творческая лаборатория сценариста / И. Б. Шубина. – 2-е изд. – Ростов н/Д : Феникс, 2004. – 351 с.

*Цітоў, А. К.* Гарадская геральдыка Беларусі / А. К. Цітоў. – Мінск : Полымя, 1989. – 207 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Арганізацыя самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне

Напісанне творчай работы і яе прэзентацыя, якая спрыяе выкарыстанню атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці, – заключны этап самастойнай работы студэнта ў першым і другім семестрах навучання па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя свят». Тэма работы – свята і яго культурна-гістарычныя традыцыі ў грамадстве (па выбары студэнта). У творчай рабоце неабходна выкарыстоўваць дакладныя веды аб традыцыях святкаванняў у адпаведную культурную эпоху, стварыць мультымедыйную прэзентацыю па выбранай тэме. Абарона творчай работы (або прэзентацыя) павінна ўключаць фота-, відэаматэрыялы, тэатралізацыю, акцёрскую манеру выкладання.

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Метады вуснай дыягностыкі (апытанне, гутарка, дыскусія; дыспуты па ведах, атрыманых на занятках; аналіз творчых работ, залік, экзамен).

Метады практычнай дыягностыкі (выбар тэмы творчай работы, складанне плана для напісання і абароны творчай работы, выкананне вучэбна-творчых заданняў выкладчыка).

Метады графічнай дыягностыкі (пісьмовая творчая работа або рэферат, стварэнне мультымедыйнай прэзентацыі па выбранай тэме).

Інтэрактыўныя метады дыягностыкі (творчы паказ,ралявыя гульні, сітуатыўныя задачы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ